Аўсейчык, У.Я. Асаблівасці каляндарна-памінальных абрадаў беларусаў Лепельшчыны (па матэрыялах XIX – пачатку XXI ст.) / У.Я. Аўсейчык // Лепельскія чытанні : матэрыялы VI навукова-практычнай канферэнцыі, (Лепель, 17 – 18 кастрычніка 2014 г.) / Установа культуры "Лепельскі раённы краязнаўчы музей". – Мн.: Медысонт, 2014. – С.50-58.

# АСАБЛІВАСЦІ КАЛЯНДАРНЫХ ПАМІНАЛЬНЫХ АБРАДАЎ БЕЛАРУСАЎ ЛЕПЕЛЬШЧЫНЫ (па матэрыялах XIX – пачатку XXI стагоддзя)[1]

**У.Я. Аўсейчык**

Традыцыйная духоўная культура этнасу не з'яўляецца нечым адзіным, гамагенным і цэльным. Яна існуе і функцыянуе выключна ў дыялектнай форме, у форме мясцовых, вузкалакальных варыянтаў. Гэта тычыцца не толькі традыцыйнай культуры ў цэлым, але і яе асобных частак. Дадзеная асаблівасць характэрна і для пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў. У асобных лакальных традыцыях пахавальныя і памінальныя абрады маюць сваю спецыфіку. У дадзеным артыкуле разгледжаны асаблівасці каляндарных памінальных абрадаў беларусаў Лепельшчыны, якая з'яўляецца вельмі адметным рэгіёнам Падзвіння. Спецыфіка менавіта каляндарнай памінальнай абраднасці найбольш выразная і паказальная, паколькі рытуалы каляндарнага цыкла, у адрозненні ад сямейнага, маюць больш лакальных адрозненняў.

**Дзяды.** У цыкле каляндарных памінальных абрадаў беларусаў Лепельшчыны важнае месца займаюць абрады ўшанавання продкаў – Дзяды[2]. У рэгіёне беларускае насельніцтва адзначае іх ад аднаго да шасці разоў на год. На Лепельшчыне зафіксаваны *Масленічныя* (*Мясаедныя, Масленыя*), *Радаўніцкія*, *Траецкія*, *Пятроўскія*, *Узвіжанскія*, *Пакроўскія*, *Дзмітраўскія (Змітраўскія, Зьмітры)* Дзяды. Іх колькасць у канкрэтным выпадку абумоўлена лакальнай традыцыяй: *«Сколькі разоў Дзяды? – І Траецкія, і на Радаўніцу пасьля Пасхі. А там ці шасьцёра іх было <…> Зьмітраўскія. – А на Узьвіжання ці былі? – Былі»*[3]; *«Дзяды былі Траецкія, Пятроўскія, Змітраўскія. Іх троя»*[4]; *«Первы раз Траецкія Дзяды, патом Узвіжанскія Дзяды, патом Змітраўскія Дзяды»*[5]; *«Былі Радаўніцкія, Траецкія, Пакроўскія, Змітраўскія»*[6]. Разыходжанні ў колькасці Дзядоў на

---

[1] Артыкул падрыхтаваны ў ходзе працы па тэме «Этнакультурны ландшафт Беларускага Падзвіння: рэгіянальная спецыфіка і заканамернасці функцыянавання ў сярэдзіне XIX – пачатку XXI ст.» (ГБ 0814).

[2] Больш падрабязна гл.: Аўсейчык У.Я. Абрад Дзяды на Лепельшчыне // Нарысы гісторыі Лепельшчыны: зборнік артыкулаў / пад агульн. рэд. Я.А. Грэбеня, А.У. Стэльмах. – Віцебск, 2012. – С. 59–65.

[3] Запісана ў 2006 г. Валодзінай Т.В. ад Крыцкай Н.Р., 1924 г. н. у в. Валова Гара Лепельскага раёна (усе наступныя запісы таксама зроблены ў Лепельскім раёне).

[4] Зап. у 2001 г. Валодзінай Т.В., Пшонка Т.М. ад Жарнасек С.В., 1924 г. н. у в. Прудок.

[5] Зап. у 2006 г. Валодзінай Т.В., Боганевай А.М. ад Крыцкай В.І., 1949 г. н. у в. Аношкі.

[6] Зап. у 1999 г. Валодзінай Т.В. ад Якубоўскай Э.Б., 1937 г. н. у в. Гадзіўля.

год фіксуюцца ў межах невялікіх тэрыторый і характэрны нават для суседніх вёсак. Як адзначаў этнограф А.Р. Пшчолка, у канцы XIX ст. жыхары в. Падмікітаўка Лепельскага павета паміналі сваіх памерлых пяць разоў на год, у той час як суседнія зарачане – шэсць [9, с. 3]. У канцы XIX ст. на Лепельшчыне зафіксавана традыцыя напярэдадні Дзядоў святкаваць *«Бабы»*, якія адрозніваліся ад «Дзядоў» толькі асартыментам памінальных страў [4, с. 56].

Абавязковай працэдурай напярэдадні Дзядоў было мыццё ў лазні. На дадзеным этапе прыгатавання да свята на Падзвінні існавалі лакальныя адрозненні ў залежнасці ад часу яго правядзення. Так, у Віцебскім павеце ў лазні мыліся ў дзень, які папярэднічаў Дзядам [13, с. 598, с. 631], а ў Лепельскім, як і ў Гарадоцкім і Вілейскім (сучасны Докшыцкі раён) паветах – на самі Дзяды [9, с. 16–18; 11, с. 258; 12, с. 376; 13, с. 631].

Рэгіянальныя рысы, што характэрныя для ўсяго падзвінскага рэгіёна, і лакальныя адрозненні яскрава прасочваюцца ў традыцыях памінальнай трапезы. Амаль паўсюдна на Падзвінні было распаўсюджана патрабаванне гатаваць да памінальнага стала няцотную колькасць страў [6, с. 296]. Падобныя перакананні ў наш час яшчэ бытуюць сярод беларусаў Лепельшчыны [1, с. 62]. Для Падзвіння найбольш характэрнымі з'яўляюцца тры памінальныя стравы: куцця, поліўка (юшка) і клёцкі. Гэта тычыцца як памінальнай вячэры ў дзень пахавання, так і каляндарных памінак [3, с. 40]. На Лепельшчыне і ў сучасны перыяд да абрадавай вячэры гатуюць куццю, клёцкі (або бліны) і поліўку [8, с. 223].

У канкрэтных лакальных традыцыях Падзвіння асартымент страў, што рыхтуюць на памінальную трапезу, некалькі адрозніваўся [3, с. 40]. Разам з разыходжаннямі ў асартыменце памінальных страў адрозненні іншы раз тычыліся рэцэптаў прыгатавання адных і тых жа. Так, у заходняй і цэнтральнай частках Падзвіння (Лепельшчына, Дзісеншчына, Докшыччына, Полаччына, Ушаччына, Шуміліншчына) клёцкі да абрадавага стала пераважна рабілі з *«душамі»* (кавалкамі сала ці мяса ўнутры), у той час як на ўсходзе рэгіёна (Бешанкоўшчына, Талачыншчына, Чашніччына) пашырана традыцыя гатаваць клёцкі без «душ» [3, с. 40]. Традыцыя гатаваць клёцкі з «душамі» яшчэ фіксуецца сярод вясковага насельніцтва Лепельшчыны: *«Баба казала, даўней нада было поліўка, каша, клёцкі. Клёцкі дзяроныя і з душамі»*[7]; *«Вечарам, печы топім, клёцкі варым. <…> З душамі абізацельна, не бялёныя, душа чалавечая ўхадзіла на эты Дзяды. Дык усё ўрэмя з душамі»*[8]. У рэгіёне зафіксаваны і выпадкі гатавання да абрадавай вячэры клёцак без «душ». Пераважна гэта тычыцца перасяленцаў з суседніх усходніх раёнаў: *«Гатовілі, первая далжна быць*

---

[7] Зап. у 2007 г. Валодзінай Т.В. ад Маляўка Г.С., 1930 г. н. у в. Завадзіна.
[8] Зап. у 2007 г. Валодзінай Т.В. ад Буржынскай Н.К., 1918 г. н.у в. Завадзіна.

*куцця. А тады там што хто прыгатовіць. Блінчыкі там з тварагом ці аладзья якія, ці што. Клёцкі абізацельна. – А з душамі? – Гэта драныя з душамі. А так пшонныя. А я тады малаком бялю. У малако клёцкі»*[9]. Такім чынам, Лепельшчына з'яўляецца своеасаблівым «памежжам» арэала распаўсюджвання такой абрадавай стравы як клёцкі з «душамі».

Парадак спажывання страў на Дзяды у рэгіёне меў сваю спецыфіку. На Лепельшчыне першай рытуальнай стравай, з якой пачыналі святочную вячэру была куцця, на сярэдзіне вячэры падавалі клёцкі, а завяршалі стол поліўкай [8, с. 222].

На Падзвінні ў сучасны перыяд яшчэ захоўваецца традыцыя, перш чым прыступаць да трапезы, адкладаць ад кожнай стравы ў асобную міску і адліваць у чарку гарэлку (для «дзядоў»). У некаторых лакальных варыянтах абраду для памерлых продкаў іншы раз накрывалі асобны стол. У с. Домжарыцы (сучасны Лепельскі раён) стол для дзядоў ставілі каля парога. Падаючы на стол вячэру для сям'і, гаспадыня перш за ўсё аддзяляла частку ад кожнай стравы і ставіла на гэты стол [7, с. 188].

Абрадавая вячэра на Дзяды патрабавала вельмі строгай рэгламентацыі паводзін і выканання спецыфічных патрабаванняў. Некаторыя з іх былі звязаны з верай у тое, што на памінальнай трапезе прысутнічаюць таксама душы памерлых продкаў. Так, на Лепельшчыне (с. Домжарыцы) у час памінальнай вячэры існавала прадпісанне абавязкова класці лыжкі на стол пасля ўсялякага спажывання ежы [7, с. 188]. У в. Гадзіўля Лепельскага раёна існуюць больш дэталёвыя прадпісанні адносна таго, як трэба класці лыжкі на стол: *«І ложкі на Дзяды ні так клалі. Так кладзеш выемкай уверх, а то ўніз на Дзяды нада. І ясі так: зачарпнуў адзін раз, у рот узяў, а тады палажы ўніз выемкай»*[10]. Дадзенае прадпісанне тлумачыцца тым, што ў адваротным выпадку памерлыя продкі могуць есці з такой лыжкі, і гэта нашкодзіць чалавеку [10, с. 124].

Спецыфічнай рысай каляндарнай памінальнай абраднасці беларусаў Лепельшчыны з'яўляецца наяўнасць Дзядоў, прымеркаваных да Узвіжання (14 / 27.IX). Дадзеная традыцыя зафіксавана ў заходняй частцы раёна. Узвіжанскія Дзяды распаўсюджаны таксама ва ўсходняй частцы суседняга Докшыцкага раёна [2, с. 632].

**Велікоднае і радаўніцкае памінанне.** Сярод памінальных абрадаў беларусаў Лепельшчыны, якія ўключаюць абавязковае наведванне могілак, асабліва важнае значэнне мае памінанне продкаў на Вялікдзень і Радаўніцу.

На тэрыторыі рэгіёна распаўсюджана традыцыя памінаць памерлых у першы дзень Вялікадня. Наведванне могілак у гэты дзень

[9] Зап. у 2014 г. аўтарам ад Шушкевіч Н.Н., 1923 г. н. у в. Слабада (нар. у в. Мар'іна Чашніцкага р-на).
[10] Зап. у 1999 г. Валодзінай Т.В. ад Якубоўскай Э.Б., 1937 г. н. у в. Гадзіўля.

прадугледжвала «хрыстасаванне» з памерлымі, калі на магілу прыносілі фарбаванае велікоднае яйка, а таксама розныя стравы і гарэлку: *«На Пасху можа на кладбішча хадзілі. Нада яйцо занясці, нада ў чараццы водкі занясці. Цяпер кажуць што нельзя водкі нясці на кладбішча. Ну і там чаго там. І здоба нейкую і канфетку на кладбішча нясуць»*[11]. У сучасны перыяд, як адзначаюць рэспандэнты, такая традыцыя паступова знікае пад уплывам святароў: *«Насілі* [яйка – *А.У.*]. *Мы ўсё врэмя насілі на Пасху і ішлі, і там Пасху правадзілі. А цяпер бацюшка сказаў, што ні нада»*[12].

На Лепельшчыне распаўсюджана таксама традыцыя памінаць памерлых на Радаўніцу. Пра гэта сведчаць этнаграфічныя крыніцы XIX – пачатку XX ст. і сучасныя палявыя матэрыялы. Шырокае распаўсюджанне ў рэгіёне радаўніцкіх памінанняў у немалой ступені абумоўлена афіцыйным памінальным статусам свята ў праваслаўнай царкве. У сучасны перыяд на Беларусі яго статус падмацоўваецца заканадаўча (Радаўніца – афіцыйны непрацоўны дзень у краіне).

Згодна з традыцыяй наведванне могілак на Радаўніцу адбываецца ў сярэдзіне дня. Сярод беларусаў Лепельшчыны ў сучасны перыяд яшчэ бытуе прыказка адносна такога часу памінання памерлых: *«А што на Радуніцу рабілі ? – На кладбішча хадзілі. Да абеда плачуць, пасля абеда пляшуць. Да абеда робілі ў калхозе, патом адпускалі»*[13]. Наведванне могілак на Радаўніцу ў шэрагу населеных пунктаў раёна суправаджаецца памінальнай трапезай: *«Мы на Раданіцу ходзім. Нясём бутылку туды, садзімся, стол у нас там. Сядзім, памінаем»*[14].

На тэрыторыі Лепельскага раёна зафіксавана традыцыя наведваць могілкі не толькі ў аўторак Фаміного тыдня, які мае назву *«Мёртвая»* Радаўніца, але і на *«Жывую»* Радаўніцу, якая адзначаецца напярэдадні, у панядзелак: «*Ходзюць на первую Радуніцу* [жывую – *А.У.*], *убіраюць кладбішча ўсё і садзяць цвяты. <…> А на другую – Дзяды спраўляюць, ну і прыізджаюць і памінаюць на кладбішчы»*[15]; *«Первая Радаўніца ў панядзелак. Гэта шчытаецца жывая Радаўніца. Ідзеш убіраеш на кладбішча. А ўжо ў ваўторак шчытаецца мёртвая Радаўніца, патаму што куццю варыш, клёцкі»*[16].

**Траецкая памінальная абраднасць.** Характэрнай асаблівасцю каляндарнай памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння з'яўляецца траецкі памінальны комплекс. У іншых частках краіны ён не такі распаўсюджаны. У сучасны перыяд памінкі, прымеркаваныя да гэтага

[11] Зап. у 2007 г. Шыпіла Н., Жолудзевай П. ад Чэклін А.П., 1931 г. н. у в. Макараўшчына.
[12] Зап. у 2014 г. аўтарам ад Маляўка М.А, 1936 г. н. у в. Слабада.
[13] Зап. у 2007 г. экспедыцыяй ПДУ ад Кажан Г.А., 1933 г. н. у в. Залессе.
[14] Зап. у 2007 г. Мядзведзевай А., Шумілавым Д. ад Надзеі Пятроўны, 1937 г. н. у в. Катоўшчына.
[15] Зап. у 2014 г. аўтарам, Валодзінай Т.В., Лобачам У.А. ад Кліманскай С.С., 1934 г. н. у в. Свядзіца.
[16] Зап. у 2014 г. аўтарам, Валодзінай Т.В., Лобачам У.А. ад Клундук З.М., 1930 г. н. у в. Свядзіца.

свята, пашыраюцца на тэрыторыю ўсёй краіны, паколькі Тройца з'яўляецца афіцыйна дазволеным у праваслаўнай царкве днём памінання памерлых, а субота напярэдадні – адна з «усяленскіх радзіцельскіх субот».

У сучасны перыяд на Лепельшчыне памінанне памерлых на Тройцу стала даволі пашыраным: *«І на Пасху ходзюць на кладбішча? – Да, у нас ходзюць, на первы дзень. А на Тройцу дык і ваабшчэ як гаворуць цэлы фэст»*[17]. У рэгіёне адбываецца распаўсюджанне памінальных абрадаў у гэты час нават на той тэрыторыі, для якой у мінулым яны не былі характэрны: *«На Радуніцу сама болей, а на Тройцу неяк уперад саўсім не хадзілі, а вот цяпер дажэ на Тройцу і ходзяць, ці на машынах, ай-яй сколькі прыязджаюць»*[18].

Элементы памінальнай абраднасці, а таксама ўяўленні аб памерлых і «тым» свеце ўключаны ў структуру іншых каляндарных абрадаў. Да іх ліку адносіцца **Яблычны Спас** (6 / 19.VIII). На Лепельшчыне шырока распаўсюджана прадпісанне не есці да Спаса яблыкаў тым маці, у якіх памерлі дзеці (характэрна і для астатняй часткі Падзвіння). Лічыцца, што ў адваротным выпадку памерлым дзецям не дастанецца яблыкаў на «тым» свеце ў гэты дзень: *«Вот, прымерна, у мамы памёрлі дзеці. Мама да Іспаса яблыкаў ня ела, а после Спаса. Тады спрашываю: "Чаго ты?" "А, мая дачушка, а там жа Жэнечку і Валодзячку ні дадуць яблычка. Скажуць, што мамка твая з'ела"»*[19]. У некаторых месцах Лепельскага раёна да гэтага свята прымяркоўвалі наведванне могілак з мэтай аднесці на магілы сваіх памерлых родзічаў яблыкі.

На тэрыторыі Лепельскага раёна зафіксавана традыцыя наведваць могілкі на **Вербніцу**: *«Ілі Вербніца. Пасвянчу вербу я, к сваім родзічам іду. – Вербачку туды? – Да, торкаю ветачкі вербы»*[20]. У рэгіёне яна не мае шырокага распаўсюджання. У канцы XIX – пачатку XX ст. наведванне могілак на Вербніцу і звычай уторкваць на магілах галінкі вярбы былі зафіксаваны таксама ў Віцебскім і Полацкім паветах. Гэта наведванне суправаджалася спецыяльнымі рытуальнымі дзеяннямі (тры разы сцябалі магілу вярбой і прамаўлялі характэрнае прывітанне) [5, с. 16–17]. Наведванне могілак з гэтай мэтай у Віцебскім павеце іншы раз адбывалася на Вялікдзень або Радаўніцу [13, с. 619]. У сучасны перыяд такая традыцыя яшчэ фіксуецца ва ўсходняй частцы Докшыцкага раёна [2, с. 629–630].

Такім чынам, каляндарныя памінальныя абрады беларусаў Лепельшчыны маюць сваю спецыфіку. Яна прасочваецца як па асобных элементах, так і іх групах. Адметнасць памінальнай абраднасці з'яўляецца

---

[17] Зап. у 2006 г. Валодзінай Т.В., Боганевай А.М. ад Крыцкай В.І., 1949 г. н. у в. Аношкі.
[18] Зап. у 2007 г. Шыпіла Н., Жолудзевай П. ад Чэклін А.П., 1931 г. н. у в. Макараўшчына.
[19] Зап. у 2014 г. аўтарам ад Маляўка М.А, 1936 г. н. у в. Слабада.
[20] Зап. у 2014 г. аўтарам ад Маляўка М.А, 1936 г. н. у в. Слабада.

неад’емнай часткай этнакультурнай спецыфікі Лепельшчыны. Разам з тым, у межах Лепельскага рэгіёна каляндарныя памінанні маюць лакальныя адрозненні. Нягледзячы на мадэрнізацыю і ўніфікацыйныя тэндэнцыі ў культуры беларусаў у XX – пачатку XXI ст., каляндарныя памінальныя абрады беларускага насельніцтва Лепельшчыны яшчэ і ў наш час працягваюць захоўваць рэгіянальныя асаблівасці і лакальную разнастайнасць.

## Спіс крыніц і літаратуры


1. Аўсейчык, У.Я. Абрад Дзяды на Лепельшчыне / У.Я. Аўсейчык // Нарысы гісторыі Лепельшчыны : зборнік артыкулаў / уступ. арт. Г.М. Якаўлевай ; пад агульн. рэд. Я.А. Грэбеня, А.У. Стэльмах. – Віцебск, 2012. – С. 59–65.
2. Аўсейчык, У.Я. Асаблівасці пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Полацкага Падзвіння (па этнаграфічных і фальклорных матэрыялах XIX – пачатку XXI ст.) / У.Я. Аўсейчык // Полацк у гісторыі і культуры Еўропы : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Полацк, 22–23 мая 2012 г. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі, Полацкі дзярж. ун-т; рэдкал. : А.А. Каваленя [і інш.]; навук. рэд., уклад. В.М. Ляўко. – Мінск, 2012. – С. 623–636.
3. Аўсейчык, У.Я. Восеньскія Дзяды ў беларусаў Падзвіння : рэгіянальныя асаблівасці і лакальныя варыянты / У.Я. Аўсейчык // Весн. Полац. дзярж. ун-та. Сер. А. Гуманіт. навукі. – 2012. – №9. – С. 35–44.
4. Богданович, А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Этнографический очерк / А.Е. Богданович. – Гродно : Губернская типография, 1895. – III, 186 с.
5. Никифоровский, Н.Я. Освященные предметы и отношение к ним простонародья Витебской Белоруссии / Н.Я. Никифоровский. – Витебск : типолитогр. насл. М.Б. Неймана, [1903?]. – [2], 26 с.
6. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н.Я. Никифоровский. – Витебск : Губерн. Типо-Литограф., 1897. – [2], X, 307, 30 с.
7. Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / рэдкал. : А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.] ; уклад. тэкстаў, уступ. артыкул і камент. У.А. Васілевіча ; артыкул, сістэматызацыя і камент. напеваў Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – 615 с.
8. Пшонка, Т.М. Асаблівасці выкарыстоўвання традыцыйнай ежы ў святах народнага календара Лепельшчыны / Т.М. Пшонка // Народная культура Віцебшчыны : матэрыялы навук.-практ. канф. «Працэсы

мадэрнізацыі народнай культуры і вопыт устаноў культуры і адукацыі Віцебшчыны па захаванню традыцый», Віцебск, 26–27 мая 2005 г. : [прысвяч. 160-годдзю М. Нікіфароўскага] / рэдкал. : Л. Вакар [і інш.]. – Віцебск, 2007. – С. 219–224.

9. Пщелко, А.Р. Деды. Этнографический очерк из жизни Лепельских белорусов / А.Р. Пщелко. – Витебск : Губернская Типо-Литография, 1898. – 23 с.

10. Толстой, Н.И. Переворачивание предметов в славянском погребальном обряде / Н.И. Толстой // Исследования в области балто-славянской духовной культуры. Погребальный обряд. – М., 1990. – С. 119–128.

11. Троицкий, А. Уклад / А. Троицкий // Литов. епарх. ведомости. – 1875. – 27 июл. – С. 69–70.

12. Шейн, П.В. Белорусские народные песни / П.В. Шейн. – СПб. : Тип. П. Майкова, 1874. – 548 с.

13. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – СПб. : Тип. имп. акад. наук, 1890. – Т. 1. Ч. 2 : Бытовая и семейная жизнь белорусов в обрядах и песнях. – XXXIV, 712, [4] с.